**УДК 811.161.3:811.112**

# АСАБЛІВАСЦІ СЕМАНТЫЗАЦЫІ НЯМЕЦКІХ АДДЗЕЯСЛОЎНЫХ НАЙМЕННЯЎ АСОБЫ СРОДКАМІ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

***М.М. КУЗНЯЦОВА***
***(Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы)***
***miriam-k@mail.ru***

*Праводзіцца супастаўляльнае даследаванне семантыкі аддзеяслоўных найменняў асобы ў беларускай і нямецкай мовах на падставе сучасных лексікаграфічных крыніц. У выніку даследавання выяўлены разыходжанні ў семантызацыі аддзеяслоўных найменняў асобы пры іх перакладзе. Апісаны выпадкі, калі субстантывы, якія маюць у сабе семантыку асабовасці і неасабовасці, пададзены ў перакладных слоўніках больш звужана (толькі як назвы асобы або прадмета), а тыя, што абазначаюць толькі асобу або прадмет – з больш шырокай семантыкай (абазначаюць як асобу, так і прадмет). Разглядаюцца таксама асаблівасці аддзеяслоўных намінацый асобы англійскага паходжання ў беларускай і нямецкай мовах, прыводзяцца прыклады няпоўнага або недакладнага перакладу дэвербальных найменняў асобы з нямецкай мовы на беларускую. Практычная значнасць вынікаў даследавання звязана з магчымасцю іх выкарыстання ў курсах лекцый па кантрастыўнай лінгвістыцы, пры выкладанні беларускай і нямецкай моў у якасці замежных і карэкціроўцы двухмоўных слоўнікаў.*

***Ключавыя словы:*** *аддзеяслоўныя намінацыі асобы, адпаведнік, пераклад, семантыка, дэфініцыя.*

**Уводзіны.** Праблема выбару адпаведнікаў пры перакладзе з адной мовы на другую досыць актуальная і выклікае цікавасць у навукоўцаў. Вырашэнню гэтай праблемы, безумоўна, спрыяюць лексікаграфічныя выданні – перакладныя і тлумачальныя слоўнікі, а таксама слоўнікі абмежаваных груп лексікі, у якіх зафіксаваны не толькі раней вядомыя але і новыя лексічныя адзінкі, у тым ліку неалагізмы – намінацыі асобы. Пры параўнанні аддзеяслоўных намінацый асобы ў беларускай і нямецкай мовах намі былі выяўлены шматлікія разыходжанні і недакладнасці ў іх семантызацыі, асабліва пры перакладзе з адной мовы на другую. Таму бачыцца слушным разгляд гэтай праблемы, а вынікі даследавання стануць карыснымі пры дапрацоўцы і перавыданні перакладных нямецка-беларускіх і беларуска-нямецкіх слоўнікаў. Для адбору беларускіх і нямецкіх дэвербальных намінацый асобы з мэтай правядзення супастаўляльнага аналізу вызначанай катэгорыі найменняў мы выкарыстоўвалі сучасныя лексікаграфічныя крыніцы: беларуска-нямецкі слоўнік [1], нямецка-беларускі слоўнік [2], тлумачальны слоўнік беларускай мовы [3], тлумачальны слоўнік нямецкай мовы Duden-online [4]. Пераклад і значэнні некаторых лексічных адзінак удакладняліся пры дапамозе нямецка-рускага слоўніка [5], перакладнога слоўніка Multitran [6] і тлумачальнага слоўніка Oxford Dictionaries [7].

У сувязі з тым, што многія нямецкія аддзеяслоўныя дэрываты маюць некалькі адпаведных субстантываў у беларускай мове, паўстае праблема іх адэкватнага падбору пры тлумачэнні сродкамі беларускай мовы. Нямецкія аддзеяслоўныя дэрываты на *-er* могуць быць як асабовымі, так і неасабовымі і адначасова абазначаць не толькі асобу, але і прадмет, жывёлу або працэс дзеяння, выражанага дзеясловам, напрыклад: *Ablader m*[1] – 'грузчык, рабочы па разгрузцы' і 'разгрузачнае ўстройства', *Jäger m* – 'паляўнічы, егер' і '*разм.*[2] (самалёт-) знішчальнік', *Lenker m* – 'рулявы, вадзіцель, шафёр, вагонаважаты, пілот, вазніца, фурман' і 'руль (ровара, матацыкла); *тэх.*[3] прывадны рычаг; павадок' (называюцца асобы паводле занятку і тэхнічныя прыборы або прылады, якія часам выконваюць функцыі чалавека), *Finder m* – 'паляўнічы сабака' і 'той, хто знайшоў згубленую рэч'; *высок.*[4] 'адкрывальнік', *Kläffer m* – *пагард.*[5] 'брахлівы сабака' і 'буркун', *Leger m* – 'курыца-нясушка' і 'насцільшчык; паркетчык', *Quäker m* – 'квакуха (жаба)' і 'піскун, віскун (пра чалавека)' (называюцца прадстаўнікі жывёльнага свету і адначасова асобы або неадушаўлёныя прадметы), *Nicker m* – 'ківок', 'кароткі сон (седзячы)' і 'той, хто ківае', *Schnalzer m* – 'пстрычка' і 'чалавек, які чмякае', *Schnaufer m* – '(гучны) уздых' і 'чалавек, які цяжка дыхае (пыхціць, задыхаецца); высакамерны чалавек', *Schnitzer m* – *разм.* 'промах, памылка; ляпсус' і 'рэзчык (па дрэву, косці)' (называюцца асобы і адначасова іх дзеянні).

**Асноўная частка.** У выніку аналізу нямецкіх аддзеяслоўных найменняў асобы намі выяўлены разыходжанні і недакладнасці ў іх семантызацыі сродкамі беларускай мовы. Спачатку разгледзім выпадкі, калі нямецкія найменні, якія абазначаюць толькі асобу або толькі прадмет, падаюцца ў перакладным

---

[1] m – (ням.) назоўнік мужчынскага роду.
[2] разм. = разг. (рус.) – размоўнае.
[3] тэх.= тех. (рус.) – тэхнічнае.
[4] высок. – высокае.
[5] пагард. – пагардлівае.

нямецка-беларускім слоўніку з абодвума значэннямі. Толькі асабовым, паводле Duden, з'яўляецца найменне *Antreiber m* 'jemand, der andere [zur Arbeit] antreibt' – 'наглядчык; пагоншчык', 'падбухторшчык', а ў НБС[6] прысутнічае дадатковае тэхнічнае азначэнне 'кулачок' [2, с. 57]. Нямецкае аддзеяслоўнае найменне *Erzeuger m* '1. (besonders Amtssprache) leiblicher Vater; 2. a. jemand, der etwas (eine Ware) produziert; b. (österreichisch) jemand, der etwas erzeugt)' [4] перакладзена на беларускую мову ў трох дэфініцыях: "1. *біял.*[7] бацька; вытворнік, самец; 2. *эк.*[8] вытворца; 3. *тэх.* генератар" [2, с. 218]. Паказальна, што ў тлумачальным слоўніку Duden гэты субстантыў адзначаны толькі як асабовы, што адпавядае першым двум значэнням у перакладным слоўніку. Нямецка-беларускі слоўнік адзначае магчымасць размоўнага ўжывання наймення *Faulenzer m* у значэнні 'кушэтка' [2, с. 228], а ў НРС[9] тлумачыцца і як 'шэзлонг'. У Duden яно толькі асабовае *Faulenzer m* 'jemand, der faul ist, zu viel faulenzt' [4] – 'лодар', 'абібок', 'гультай' [8, с. 70].

Да нямецкага *Ausläufer m* '1. etwas, worin etwas ausläuft, endet; 2. (Botanik) Seitenspross, -trieb 3. (österreichisch, schweizerisch, sonst veraltet) Bote)' [4] перакладны слоўнік НБС падае наступныя дэфініцыі: "1. пасыльны; 2. сучок, парастак (расліны); 3. нашчадак" [2, с. 83], аднак у слоўніку Duden апошняга значэння 'нашчадак' не фіксуецца. Нямецкі аддзеяслоўны дэрыват *Förderer m* 'jemand, der jemanden, etwas fördert' тлумачыцца ў слоўніку Duden толькі як асабовае найменне, а менавіта 'той, хто спрыяе, садзейнічае каму-н., чаму-н.'. НБС падае гэты нямецкі субстантыў як асабовы і неасабовы: "1. мецэнат; заступнік; 2. *тэх.* транспарцёр, канвеер; 3. *горн.*[10] рудаадкатчык" [2, с. 247]. Паводле слоўніка Duden, нямецкае *Entzifferer m* 'jemand, der einen Code, eine unbekannte Schrift entziffern kann' з'яўляецца асабовым субстантывам і тлумачыцца як 'той, хто можа расшыфраваць код, невядомы шрыфт'. У перакладным нямецка-рускім слоўніку яно падаецца не толькі як асабовы агентыў са значэннем 'шыфравальшчык', але і як неасабовы назоўнік у значэнні 'дэшыфратар' [5, с. 274]. Да ням.[11] *Einleger m* 'jemand, der Geld bei einer Bank einlegt, eingelegt hat', які ў слоўніку Duden мае адзінае значэнне 'укладчык' або 'той, хто ўкладвае грошы ў банк', у нямецка-рускім слоўніку падаюцца некалькі адпаведнікаў "1. вкладчик; 2. *полигр.* накладчик; 3. *текст.* подавальщик" [5, с. 252], а на беларускую мову яго пераклад увогуле адсутнічае. Нямецкаму аддзеяслоўнаму найменню асобы *Gewinner m* 'jemand, der gewinnt' у рускай мове таксама адпавядае персанальны агентыў *выигравший*; *победитель* [5, с. 383], а ў НБС – наступныя дэфініцыі "1. пераможца, той, хто выйграў; 2. нумар, на які выпаў выйгрыш" [2, с. 297].

Бачым і выпадкі, калі нямецкія найменні, якія адначасова маюць у сабе семантыку асабовасці і неасабовасці, перакладзены на беларускую мову толькі ў адным з гэтых значэнняў. Так, нямецкаму *Dreher m* у НБС адпавядае толькі асабовы субстантыў *токар (па метале)* [2, с. 162], а ў слоўніку Duden ёсць яшчэ два азначэнні: 'падобны да лэндлера народны танец з Аўстрыі' і 'паварот вакол сваёй восі' [4]. У якасці адпаведніка да нямецкага *Drucker m* '1. jemand, der das Handwerk des Druckens ausübt (Berufsbezeichnung); 2. (EDV[12]) Gerät zum Drucken von im Computer gespeicherten Texten, Bildern u.a.' [4] у НБС зафіксаваны толькі асабовы субстантыў *друкар* [2, с. 164], аднак у нямецкай мове *Drucker m* мае яшчэ адно значэнне 'прылада для друку' (параўн. з НРС: "1. печатник; 2. *текст.* набойщик; 3. *вчт.*[13] печатающее устройство" [5, с. 229]). Нямецкае *Flieger m* '1. Pilot; 2. a. (umg) Angehöriger der Luftwaffe; b. einfacher Soldat der Luftwaffe; 3. Tier, das (in bestimmter Weise) fliegen kann; 4. (umg) Flugzeug; 5. (Radrennen) Fahrer, der über kurze Strecken und ohne Schrittmacher fährt' – "1. лётчик; пилот; авиатор; рядовой военно-воздушных сил; 2. животное, которое умеет летать определенным образом; 3. *разг.* самолёт; авиация; 4. спринтер (*велоспорт*)" [5, с. 322] у НБС падаецца ў вузкім значэнні, толькі як 'лётчык', 'пілот' [2, с. 244]; нямецкі аддзеяслоўны дэрыват *Flitzer m* '1. kleines, sportliches schnelles Fahrzeug; 2. (seltener) jemand, der schnell laufen kann' [4] мае дзве дэфініцыі: '1. малы, спартыўны хуткасны аўтамабіль; 2. (*радзей*) той, хто ўмее хутка бегаць', а ў НБС ёсць толькі адна з іх – 'маалітражная хуткасная аўтамашына' [2, с. 244]. Аднак у НРС да ням. *Flitzer m* можам знайсці адпаведнікі з семантыкай асабовасці і неасабовасці: "1. скоростной малолитражный автомобиль (спортивный или военный); 2. боксёр, уклоняющийся от активного ведения боя" [5, с. 323]. Нямецкае *Schlepper m* значыцца ў НБС толькі як неасабовае 'трактар', 'цягач', 'буксір' [2, с. 635], што адпавядае першым дзвюм дэфініцыям слоўніка Duden: '1. kleineres (mit kräftiger Maschine und einer speziellen Ausrüstung ausgestattetes) Schiff zum Schleppen und Bugsieren anderer Schiffe; 2. a. Traktor; b. Kurzform für: Sattelschlepper'. Аднак у Duden бачым, што гэта найменне можа ўжывацца і ў горназдабыўной сферы для абазначэння горнарабочага, праца якога заключаецца ў тым, каб рухаць уперад ваганетку – '3. (Bergmannssprache früher) Bergarbeiter,

[6] НБС – нямецка-беларускі слоўнік.
[7] біял. – біялагічнае.
[8] эк. – эканамічнае.
[9] НРС – нямецка-рускі слоўнік.
[10] горн. – горнае.
[11] ням. – нямецкае.
[12] EDV – elektronische Datenverarbeitung – (ням.) электронная апрацоўка даных.
[13] вчт – вылічальная тэхніка.

dessen Arbeit darin besteht, Förderwagen [durch Ziehen] fortzubewegen)’, і ў якасці размоўнага (з экспрэсіяй непахвальнасці) для абазначэння асобы, якая нелегальнымі спосабамі перавозіць з адной краіны ў іншую эмігрантаў, уцекачоў і тых, хто шукае працу – ‘4. a. (umgangssprachlich, meist abwertend) jemand, der jemandem, einem oft unseriösen, illegalen, betrügerischen o. ä. Unternehmen auf fragwürdige Weise Kunden o. Ä.[14] zuführt; b. (umgangssprachlich, meist abwertend) jemand, der Flüchtlinge, Asylsuchende, Arbeitskräfte gegen Bezahlung illegal von einem Land in ein anderes bringt’[4].

Да нямецкага *Taster m* ‘1. (Fachsprache) jemand, der mittels einer Tastatur eine Maschine bedient; 2. tastenartiger Druckknopf, Drucktaste o. Ä.’Taster m’ у перакладным слоўніку НБС не сустрэлася беларускага субстантыва з семантыкай персанальнасці, а толькі неасабовыя адпаведнікі: “1. шчупальца (у насякомых); 2. *тэх., муз.*[15] клавіш(а); 3. тэлеграфічны ключ” [2, с. 727]. Таму намі прапануецца ўласная беларуская дэфініцыя нямецкага *Taster m* са значэннем асобы ‘той, хто абслугоўвае / кіруе машынай пры дапамозе клавіятуры’.

Выяўлены таксама выпадкі няпоўнага або недакладнага перакладу дэвербальных найменняў асобы з нямецкай мовы на беларускую. Так, у перакладных слоўніках да ням. *Bremser m* ‘1. (Eisenbahn früher) jemand, der [beim Rangieren] die Bremse von Eisenbahnwagen bedient; 2. (Bobsport) Schlussmann im Bob’ [4] фіксуецца наступнае: ‘*ж.-д.*[16] тормозной кондуктор’ (НРС) і “1. чалавек, які спыняе машыну; 2. чалавек, які замінае якой-н. справе” [3, с. 138]. Адзначым, што ў НБС не падаецца значэння дэрывата *Bremser m*, якое датычыць спартыўнай сферы, а менавіта бабслейнага спорту, дзе яно абазначае апошняга спартсмена ў бобе, які адказвае за спыненне саней (гл. Duden, 2 знач.). Акрамя таго, у другім значэнні ням. *Bremser m* падаецца ў НБС як ацэначнае найменне (‘чалавек, які замінае якой-н. справе’), а ў тлумачальным слоўніку Duden гэта не згадваецца [8, с. 71]. Варта было б дапоўніць і пераклад ням. *Brenner m* ‘1. Vorrichtung zum Verbrennen fester, flüssiger oder gasförmiger Brennstoffe; 2. für das Brennen von Spiritus und Branntwein ausgebildete Fachkraft; 3. (EDV) Gerät zum Brennen von CDs, DVDs o. Ä.’ – “1. газніца, спіртоўка; 2. броваршчык” [2, с. 138] трэцім значэннем, якога няма ў НБС – “устройство для записи CDR, CDRW, DVD-R, DVD+R дисков; пишущий дисковод” [6], а таксама ўзгадаць пра геаграфічную назву *Brenner* – “Бреннер (горный перевал в Альпах)” [5, с. 186]. У Duden ням. *Mittler m* ‘helfender Vermittler, Mittelsmann [ohne geschäftliche Eigeninteressen]; jemand, der vermittelnd zwischen verschiedenen Personen, Parteien o. Ä. auftritt’ [4] – гэта ‘той, хто выступае ў якасці пасрэдніка паміж некалькімі асобамі, партыямі і г. д.’. Паводле НБС яно мае два значэнні: ‘пасрэдік’ і ‘Збаўца, Збавіцель (пра Хрыста)’ [2, с. 489]. Адзначым, што першае з іх супадае з нямецкім і адпавядае яму (‘пасрэднік’), аднак другое ў Duden не фіксуецца. Высветлілася, што для абазначэння Месіі і Збаўцы ў нямецкай мове выкарыстоўваюцца такія найменні, як *Erlöser m* ‘1. jemand, der jemanden erlöst; 2. (christliche Religion) Christus als Erretter der Menschen’, *Erretter m* ‘Retter’. Сярод сінонімаў да гэтых нямецкіх субстантываў таксама не сустрэлася найменне *Mittler m*, параўн.: “Synonyme zu *Erlöser*: *Befreier, Christus, Jesus [Christus von Nazareth], Messias, Nazarener, Retter; (gehoben) Erretter; (bildungssprachlich) Salvator; (biblisch) der Gute Hirte, Friedensfürst; (christliche Religion) Heiland*; Synonyme zu *Erretter*: *Befreier, Engel, Erlöser, Heiland, Jesus, Messias, Retter”* [5].

У НБС і Multitran аднолькавы пераклад нямецкага наймення *Schmierer m* ‘(**abwertend)** 1. jemand, der schmiert (3a, 4); 2. (österreichisch) Buch, Heft mit einer fertigen Übersetzung, das in der Schule als unerlaubtes Hilfsmittel benutzt wird’ [4] – “1. змазчык; 2. *разм.* пэцкаль (пра мастака), пісака (пра пісьменніка); 3. той, хто дае хабар” [2, с. 641], “смазчик; мазила (о художнике); писака (о писателе); человек, дающий взятки, *разг.* пачкун; мазила; писака; бумагомаратель” [6]; у НРС тыя самыя значэнні, акрамя ‘хабарнік’ [5, с. 742]. Аднак у нямецкім тлумачальным слоўніку Duden дэфініцыя субстантыва *Schmierer m* больш вузкая – ‘1. той, хто няхайна піша або малюе’; ‘2. кніга або сшытак, якія выкарыстоўваюцца ў школе ў якасці недазволенага дапаможнага сродка (шпаргалкі)’. Адпаведнікамі бел.[17] *хабарнік* у нямецкай мове з’яўляюцца словазлучэнні *bestechlicher Mensch; korrupter Mensch; käuflicher Mensch; Person* f і кампазіт *Schmiergeldnehmer m*. Такім чынам, мы лічым некарэктным ужыванне беларускага наймення *хабарнік* у якасці адпаведніка нямецкага *Schmierer m*. Наяўнасць у НБС перакладу “змазчык” да ням. *Schmierer m* пры адсутнасці адпаведнага значэння ў нямецкім тлумачальным слоўніку, верагодна, выклікана выкарыстаннем у якасці крыніцы матывацыі першага значэння дзеяслова *schmieren* ‘1. a. mit Schmiermitteln versehen; ölen’ – ‘мазаць, змазваць маслам’. Такім чынам, спасылаючыся на першакрыніцу, вынікае, што нямецкі аддзеяслоўны дэрыват *Schmierer m* мае значэнне ‘пэцкаль (пра мастака), пісака (пра пісьменніка)’ з экспрэсіяй непахвальнасці і адносіцца да катэгорыі ацэначных найменняў [8, с. 72].

Няпоўны пераклад нямецкага дзеяслова *trampen* (“бадзяцца па дарогах; валацужнічаць; весці бадзяжнае жыццё” [2, с. 742]) можа прывесці да неўласцівага ўжывання яго дэрывата *Tramper m* у значэнні

---

[14] o. Ä. – oder ähnliches – (ням.) і таму падобнае.
[15] муз. – музычнае.
[16] ж.-д. – (рус.) чыгуначнае.
[17] бел. – беларускае.

'бадзяга', 'валацуга'. У нямецкім тлумачальным слоўніку найменне *Tramper m '[ˈtrɛmpe] jemand, der trampt (1)'* [4] – гэта 'той, хто падарожнічае аўтастопам', што адпавядае першаму значэнню дзеяслова *trampen '1. (durch Winken o. Ä.) Autos anhalten und sich mitnehmen lassen und auf diese Weise irgendwohin fahren, reisen; per Anhalter fahren'* [4] – 'падарожнічаць аўтастопам, на папутных машынах'. Параўнаем дэфініцыі бел. *счытчык* 'той, хто займаецца счыткай' [3, с. 429] і ням. *Ableser m 'Person, die etwas abliest (2)'* – 'асоба, якая нешта счытвае' [4] (ад ням. *ablesen '2. a. den Stand eines Messgerätes feststellen; b. die verbrauchte Menge, die [zurückgelegte] Entfernung o. Ä. an einem Messgerät feststellen'* – '2. а. вызначаць паказанні вымяральнага прыбора б. вызначаць на вымяральным прыборы расходаваную колькасць, пройдзены шлях і інш.'). У нямецкай мове гэта найменне абазначае асобу, што мае дачыненне да вымяральных прыбораў, і суадносіцца з тэхнічнай сферай, а бел. *счытчык* ужываецца для абазначэння асобы, якая звярае надрукаваны тэкст з аўтарскім арыгіналам (напрыклад, працаўнік выдавецтва, тыпаграфіі або асоба, якая ў тэатры падчас рэпетыцыі чытае п'есу па ролях), таму яно аднесена намі да слоў поліфункцыйнага ўжытку. Адсюль вынікае, што дадзеныя агентывы нельга ўжываць у якасці адэкватаў.

Нямецкі субстантыў *Streuer m* тлумачыцца ў слоўніку Duden як *'Streubüchse'*, што значыць *раскідвальнік*. У беларускай мове таксама ёсць аддзеяслоўны дэрыват *раскідвальнік* '1. той, хто займаецца раскідваннем чаго-н.; 2. прыстасаванне для раскідвання чаго-н.' [3, с. 648], але ён, у адрозненне ад неасабовага нямецкага субстантыва, абазначае як асобу, так і прадмет, параўн.: *Streuer m* – "разбрасыватель *(удобрений, семян, песка, извести и т. п.), пищ.* прибор для специй, *тех.* диффузор; рассеиватель" [6]. Таму ням. *Streuer m* не з'яўляецца адпаведнікам бел. *раскідвальнік* са значэннем асобы.

У слоўнікавым складзе беларускай і нямецкай моў ёсць субстантывы англійскага паходжання, якія сталі актыўна ўжывацца ў самых розных сферах як прафесійнай, так і непрафесійнай дзейнасці. У большасці выпадкаў яны семантычна супадаюць у абедзвюх мовах: *блогер – Blogger m, дылер – Dealer m, менеджэр – Manager m, дызайнер – Designer m* і пад. Аднак варта адзначыць, што намінацыі асобы англійскага паходжання, якія ўвайшлі ў склад беларускай мовы ў якасці запазычанняў, не з'яўляюцца адвербальнымі дэрыватамі, напр. *баксёр – суф.*[18] *ад бокс-(Ø)* [10, с. 48]. У нямецкай мове nomina agentis англійскага паходжання суадносяцца з адпаведнымі нямецкімі дзеясловамі, параўн.: ням. *Blogger m – bloggen, Dealer m – dealen, Checker m – checken, Designer m – designen, Boxer m – boxen* [9], таму звернем увагу на асаблівасці іх функцыянавання.

Некаторыя нямецкія дэвербальныя субстантывы англійскага паходжання могуць выступаць у якасці асабовых і неасабовых найменняў у залежнасці ад кантэксту ці сферы выкарыстання, напрыклад: *Boxer m* – '1. спартсмен, які ўдзельнічае ў спаборніцтве па боксе; 2. *разм.* штуршок, удар кулаком; 3. баксёр (парода сабак)'; *Cruiser m* – '1. *жарг.*[19] баксёр вагавай катэгорыі паміж паўцяжкай і цяжкай вагой; 2. спартыўны аўтамабіль з высокай магутнасцю матора, але адносна нізкай хуткасцю; 3. а. *жарг.* той, хто без якой-н. канкрэтнай мэты туды-сюды ездзіць ці ходзіць (каб на іншых паглядзець і сябе паказаць); б. *жарг.* той, хто без дазволу спраўляе з іншымі [падчас нармальнага дарожнага руху] гонкі на аўтамабілях'; *Mixer m* – '1. той, хто змешвае алкагольныя напоі; бармэн; 2. электрычны прыбор для крышэння і змешвання; 3. а. (кіно, радыё, тэлебачанне) гукааператар, (гука)мікшар; б. мікшарная прылада' [4]. Шэраг дэвербальных найменняў асобы англійскага паходжання маюць у нямецкай мове свае ўласныя адпаведнікі, напрыклад: *Fighter m* і *Kämpfer m, Sportler m*; *Cutter m* і *Schneider m*; *Designer m* і *Zeichner m, Entwerfer m*; *Killer m* і *Mörder m, (abwertend) Meuchelmörder* [4]. Акрамя таго, у нямецкай мове фіксуюцца запазычанні з англійскай мовы і калькі. Так, **ням.** *Hacker m* – '1. *тэрыт.* вінаградар, які разрыхляе глебу матыкай'; '2. *спарт.*[20] *жарг.* грубы ігрок'; '3. *англ.*[21] хакер', у апошнім значэнні супадае з англ. *hacker* '1. A person who uses computers to gain unauthorized access to data 1.1 *informal* An enthusiastic and skilful computer programmer or user 2. A person or thing that hacks or cuts roughly' [7], а ням. *Blitzer m* – '1. той, хто "бліскае", голым бегае па ажыўленых вуліцах, месцах з мэтай правакацыі' – даслоўная калька англ. *streaker;* '3. *informal* Run naked in a public place so as to shock or amuse others' [7].

Трэба адзначыць, што некаторыя нямецкія nomina agentis па гучанні і напісанні супадаюць з англійскімі агентывамі, але маюць іншае лексічнае значэнне і могуць стаць "ілжывымі сябрамі перакладчыка". Так, ням. *Blender m* сугучнае з англ. *blender* 'прыстасаванне для драбнення і змешвання', але абазначае асобу, якая выклікае прыхільнасць праз знешнія пазітыўныя якасці і такім чынам хавае свае недахопы [4]. Нямецкае *Finder m* – "1. асоба, якая знайшла што-н.; 2. *геал.*[22] вышукальнік, разведвальнік" [2, с. 239] паходзіць не з англійскай мовы, а з сярэдне-верхне-нямецкага) vindære і таму не з'яўляецца запазычаннем, хоць і супадае з англійскім *finder* у значэнні 'асоба, якая знайшла што-небудзь' [7]. Адназначым, што гэтыя субстантывы адрозніваюцца вымаўленнем каранёвага галоснага гука: ням. [ˈfɪnde] і англ.

[18] суф. – суфіксальнае.
[19] жарг. – жаргон.
[20] спарт. – спартыўнае.
[21] англ. – англійскае.
[22] геал. – геалагічнае.

[ˈfʌɪndə]. Нямецкі аддзеяслоўны дэрыват *Driver m* абазначае ‘клюшку для гольфа’ або ‘праграму, пры дапамозе якой кіруецца перыферыйная прылада (драйвер)’ [4] і толькі часткова супадае з англійскім субстантывам *driver*, які мае шмат значэнняў і абазначае як асобу (‘кіроўца’), так і прадмет [11, с. 86].

**Заключэнне.** Такім чынам, у выніку аналізу лексікаграфічных крыніц намі выяўлены выпадкі няпоўнага або недакладнага перакладу нямецкіх дэвербальных найменняў асобы на беларускую мову. Недасканаласць перакладных слоўнікаў з’яўляецца адной з прычын неадэкватнага ўжывання слоў пры пошуку іх адпаведнікаў у іншай мове. На думку О. Жэстковай, лексікаграфічныя апісанні не заўсёды поўна адлюстроўваюць дэрывацыйную семантыку аддзеяслоўных субстантываў і нават імкнуцца пазбегнуць прыкладаў неакрэсленасці семантыкі ў слоўнікавых артыкулах, што істотна ўплывае на ўяўленне аб семантычнай структуры слова. З другога боку, гэта невыразнасць значэнняў слова дапускае магчымасць іх памылковага трактавання, а таксама выклікае цяжкасці, звязаныя з вызначэннем зместу асобных лексічна-семантычных варыянтаў [12, с. 261]. Праведзены супастаўляльны аналіз беларускіх і нямецкіх аддзеяслоўных намінацый асобы дапамагае вырашыць праблему карэктнага ўжывання адпаведнікаў пры перакладзе з адной мовы на другую і раскрывае наяўнасць шырокага выбару спосабаў і сродкаў пры іх падборы. Практычная значнасць нашага даследавання бачыцца ў тым, каб зрабіць унёсак у вырашэнне гэтай праблемы ў галіне дэвербальных субстантываў з семантыкай персанальнасці.

ЛІТАРАТУРА

1. Беларуска-нямецкі слоўнік [Belarussisch-Deutsches Wörterbuch] : больш за 70 тысяч слоў і выразаў / пад рэд. М. Кур’янкі, Л. Баршчэўскага, Т. Вайлера. – Мінск : Зміцер Колас, 2010. – 608 с.
2. Кур’янка, М.І. Нямецка-беларускі слоўнік [Deutsch – belarussisches Wörterbuch] : больш за 50 000 словаў / М.І. Кур’янка. – Мінск : Зміцер Колас, 2006. – 976 с.
3. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы : у 5 т. / пад рэд. К. Атраховіча. – Мінск : БелСЭ, 1977–1984. – 5 т.
4. Duden : толковый словарь [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.duden.de/woerterbuch. – Дата доступа: 04.05.16.
5. Немецко-русский (основной) словарь: ок. 95 000 словарных статей. – 4-е изд., стереотип. – М. : Рус. яз., 1996. – 1040 с.
6. Multitran : словарь [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.multitran.ru/c/M.exe?a=1. – Дата доступа: 07.05.16.
7. Oxford Dictionaries : толковый словарь [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.oxforddictionaries.com. – Дата доступа: 11.05.16.
8. Кузняцова, М.М. Пра некаторыя разыходжанні і недакладнасці ў семантызацыі нямецка-беларускіх дэвербальных найменняў асобы / М.М. Кузняцова // Проблемы современной прикладной лингвистики : сб. науч. ст. – Минск : МГЛУ, 2014. – С. 69–73.
9. Canoonet – Deutsche Wörterbücher und Grammatik [Электронный ресурс] // Canoo Engineering AG, Basel. – Режим доступа: http://www.canoo.net. – Дата доступа: 10.11.15.
10. Словаўтваральны слоўнік беларускай мовы / А.М. Бардовіч, М.М. Круталевіч, А.А. Лукашанец. – Мінск : Беларуская навука, 2000. – 413 с.
11. Кузняцова, М.М. Nomina agentis англійскага паходжання ў нямецкай мове / М.М. Кузняцова // Идеи. Поиски. Решения : материалы VI Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 22 нояб. 2012 г. – Минск : БГУ, 2013. – С. 10–15.
12. Жесткова, О.С. К вопросу о проблеме лексикографического описания отглагольных существительных / О.С. Жесткова // Известия ПГПУ им. В.Г. Белинского. – 2012. – № 27. – С. 259–261.

*Паступіў 5.07.2016*

## SPECIAL ASPECTS OF SEMANTIZATION OF GERMAN DEVERBAL NAMES OF PERSON BY MEANS OF THE BELARUSIAN LANGUAGE

***M. KUZNIATSOVA***

*The article is dedicated to the comparative research of deverbal names of person in the Belarusian and German languages using contemporary lexicographic sources. Discrepancies in semantization of deverbal names of person were discovered in translation dictionaries. Cases are described, when substantives, which mean a person and a subject, are presented there with more narrow semantics (only as names of a person or of a subject), and those, which signify only a person or a subject – with a wider meaning (both of a person and a subject). Also special aspects of functioning of deverbal names of person of the English origin in the Belarusian and German languages are considered, examples of incomplete and inaccurate translation of deverbal agentives from German into Belarusian are given. The practical importance of the research’s results is connected with the possibility of their application in series of lectures on contrastive linguistics, in teaching Belarusian and German as foreign languages, as well as for correction of bilingual dictionaries.*

***Keywords:*** *deverbal names of persons, equivalents, translation, semantics, definition.*